**Паважаныя члены журы!**
**У дадзеным туры прадугледжана выкананне 70 заданняў, пры правільным рашэнні якіх удзельнікі алімпіяды могуць набраць 125 балаў. Правільныя адказы абазначаны тлустым шрыфтам.**

Паважаныя члены журы!
У заданнях 1–20 неабходна было выбраць адзін правільны адказ.
Правільныя адказы абазначаны тлустым шрыфтам.
**За правільны адказ – 1 бал.**

1. Наймацнейшая армія, у якой упершыню выкарыстоўваліся конніца і таран, была створана:
**А) асірыйцамі**
Б) фінікійцамі
В) егіпцянамі
Г) вавіланянамі.

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Старажытнага свету (у 2 частках, частка 1): вучэб. дапаможнік для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. С. Кошалеў, А. А. Прохараў, В. У. Перзашкевіч, В. Г. Жураўлевіч ; пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Народная асвета, 2019. – § 18, с. 75–76.

2. Існаванне Троі даказаў:
А) Д. Эванс
**Б) Г. Шліман**
В) І. Забелін
Г) Г. дэ Мартылье.

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Старажытнага свету (у 2 частках, частка 2): вучэб. дапаможнік для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. С. Кошалеў, А. А. Прохараў, В. У. Перзашкевіч, В. Г. Жураўлевіч ; пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Народная асвета, 2019. – § 3, с. 14.

3. У 1127 г.:
А) быў узяты ў палон менскі князь Глеб
Б) полацкія князі былі высланы ў Візантыю
**В) кіеўскі князь Мсціслаў арганізаваў паход на Полацкую зямлю**
Г) створана Смаленскае епіскапства.

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання і выхавання / С. М. Цемушаў, Ю. М. Бохан ; пад рэд. І. А. Марзалюка. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2023. – § 9, с. 71.

4. Фарміраванне тэрыторыі адзінай Расійскай дзяржавы было завершана ў перыяд праўлення:
А) Івана III
Б) Дзмітрыя Данскога
В) Васілія II
**Г) Васілія III.**

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Сярэдніх вякоў : вучэб. дапаможнік для 6-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання і выхавання / А. А. Прохараў [і інш.] ; пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Народная асвета, 2023. – § 22, с. 139.

5. Каму належыць фраза: «Парыж варты імшы»?
А) Георгу дэ Гізу
Б) Генрыху III
В) Кардыналу Рышэлье
**Г) Генрыху IV.**

На аснове матэрыялаў: Сусветная гісторыя Новага часу, XVI–XVIII стст. : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. С. Кошалеў [і інш.] ; пад рэд. В. С. Кошалева. – 2-е выданне, перагледж. і дап. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – § 7, с. 45.

6. Вясной 1634 г. было падпісана Палянаўскае перамір’е на:
А) 15 гадоў
**Б) 20 гадоў**
В) 30 гадоў
Г) 40 гадоў.

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст. : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. А. Варонін [і інш.] ; пад рэд. В. А. Вароніна, А. А. Скеп’ян. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2017. – § 10, с. 72.

7. Ураджэнец Гродна, праславіўся эскізамі дэкарацый і касцюмаў для артыстаў рускага балета, якія выступалі ў Парыжы ў 1907–1914 гг.:
А) Эдвард Вайніловіч
Б) Канстанцін Міцкевіч
**В) Леон Бакст**
Г) Якуб Наркевіч-Ёдка.

На аснове матэрыялаў: Паноў, С. В. Гісторыя Беларусі, канец XVIII – пачатак XX ст. : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. В. Паноў, С. В. Марозава, У. А. Сосна ; пад рэд. У. А. Сосны. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2018. – § 26, с. 122.

8. Армія Сімона Балівара поўнасцю вызваліла Венесуэлу ад іспанскіх войск у:
А) 1817 г.
Б) 1819 г.
В) 1820 г.
**Г) 1821 г.**

На аснове матэрыялаў: Кошалеў, В. С. Сусветная гісторыя Новага часу, XIX – пачатак XX ст. : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. С. Кошалеў, Н. В. Кошалева, Н. В. Байдакова ; пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2018. – § 15, с. 91.

9. Новы ўрад Італіі падпісаў перамір'е і капітуляваў:
А) 3 верасня 1942 г.
Б) 15 сакавіка 1943 г.
В) 3 ліпеня 1943 г.
**Г) 3 верасня 1943 г.**

На аснове матэрыялаў: Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. С. Кошалеў, М. А. Краснова, М. В. Кошалеў; пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. – § 21, с. 109.

10. Якую назву атрымалі самалёты, што прывозілі на радзіму «груз 200»:
А) чорныя буслы
Б) чырвоныя гваздзікі
В) пунсовыя ружы
**Г) чорныя цюльпаны.**

На аснове матэрыялаў: Паноў, С. В. Гісторыя Беларусі, 1917 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. В. Паноў, У. Н. Сідарцоў, В. М. Фамін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. – § 21, с. 111.

11. Найстаражытнейшыя рэшткі чалавека сучаснага тыпу на тэрыторыі ЗША і Чылі датуюцца:
**А) 15–16 тыс. гадоў таму**
Б) 10–11 тыс. гадоў таму
В) 20–21 тыс. гадоў таму
Г) 8–9 тыс. гадоў таму.

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – § 1, с. 22.

12. Якую ідэю М. Лютэра не падтрымліваў Ульрых Цвінглі?
**А) адхіляў любую царкоўную іерархію і інстытуты, якія не засноўваюцца на Бібліі**
Б) міласць Бога не залежыць ад заслуг чалавека
В) царква павінна быць таннай, без велізарных зямельных уладанняў і маёмасці
Г) адмаўленне ролі царквы як пасярэдніка паміж чалавекам і Богам.

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – § 36, с. 164–165.

13. Прафесар Віленскага ўніверсітэта, зрабіў дасяжнымі для даследчыкаў шэраг важных пісьмовых помнікаў, у тым ліку кнігі Ф. Скарыны:
**А) М. Баброўскі**
Б) І. Грыгаровіч
В) А. Сапуноў
Г) К. Калайдовіч.

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025. – § 12, с. 138.

14. У якім годзе Беларусь стала паўнапраўным членам Камітэта ААН па выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах?
А) 2012 г.
**Б) 2013 г.**
В) 2019 г.
Г) 2024 г.

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025. – § 50, с. 289.

15. Колькі асноўных перыядаў выдзяляюць у Другой сусветнай вайне?
А) Тры перыяды
**Б) Пяць перыядаў**
В) Чатыры перыяды

Г) Шэсць перыядаў.

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – С. 9.

16. Лётчык-знішчальнік, удзельнік вайны ў Іспаніі, баёў на рацэ Халхін-Гол, першы ў СССР двойчы Герой Савецкага Саюза 1939 г.:

А) К. П. Арлоўскі

**Б) С. І. Грыцавец**

В) Ф. К. Каўроў

Г) Г. М. Склязнёў.

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – § 1, с. 17.

17. Пачатак блакады Ленінграда:

**А) 8 верасня 1941 г.**

Б) 28 кастрычніка 1941 г.

В) 8 верасня 1942 г.

Г) 28 верасня 1941 г.

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – § 5–6, с. 75.

18. Першы этап «рэйкавай вайны» праходзіў:

А) жнівень – верасень 1942 г.

Б) верасень – лістапад 1943 г.

**В) жнівень – верасень 1943 г.**

Г) верасень – лістапад 1942 г.

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – § 10–11, с. 129.

19. Згодна з данымі Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, у лагерах смерці на тэрыторыі Беларусі нацысты знішчылі:

А) 3 млн чалавек;

Б) звыш 500 тыс. чалавек;

**В) звыш 1,4 млн чалавек;**

Г) 2 млн чалавек.

На аснове матэрыялаў: Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 10–11 класы. Вучэбны дапаможнік для навучэнцаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2023. – С. 7.

20. Калі быў акупаваны г. Гомель?

А) 11 ліпеня 1941 г.
Б) 26 ліпеня 1941 г.
В) 22 жніўня 1941 г.
**Г) 19 жніўня 1941 г.**

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – § 5–6, с. 69.

Паважаныя члены журы!
У заданнях 21–25 патрабавалася правільна суаднесці звесткі
з левай і правай калонак табліцы.
Правільныя адказы набраны тлустым падкрэсліваннем.
**За правільна выкананае заданне – да 4 балаў.**

**21. Суаднясіце даты і падзеі першабытнай гісторыі:**

| | |
|---|---|
| А) Каля 12 тыс. гадоў таму | 1) З’яўленне «чалавека ўмелага» |
| Б) Больш за 2 млн гадоў таму | 2) Узнікненне земляробства і жывёлагадоўлі |
| В) 1,5 млн гадоў таму | 3) З’яўленне «чалавека прамахадзячага» |
| Г) 10 000–8000 гадоў да н. э. | 4) Адступленне ледавіка |

**<u>А4 Б1 В3 Г2</u>**

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Старажытнага свету (у 2 частках, частка 1): вучэб. дапаможнік для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. С. Кошалеў, А. А. Прохараў, В. У. Перзашкевіч, В. Г. Жураўлевіч ; пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Народная асвета, 2019. – § 3, с. 13, § 6, с. 24–25, форзац.

**22. Суаднясіце мануфактуры з характарам іх вытворчасці:**

| | |
|---|---|
| А) Уручча | 1) вытворчасць шкла |
| Б) Свержань | 2) выраб шпалер |
| В) Карэлічы | 3) вытворчасць фаянсу |
| Г) Налібокі | 4) выраб люстэркаў і крышталю |

**<u>А4 Б3 В2 Г1</u>**

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст. : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. А. Варонін [і інш.] ; пад рэд. В. А. Вароніна, А. А. Скеп’ян. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2017. – § 22, с. 150–151.

**23. Суаднясіце даты з падзеямі гісторыі Сярэдніх вякоў:**

| | |
|---|---|
| А) 681 г. | 1) Прыняцце хрысціянства ў Першым Балгарскім царстве |
| Б) VII ст. | 2) Утварэнне Першага Балгарскага царства |
| В) пачатак IX ст. | 3) Стварэнне саюзу славянскіх плямёнаў на чале з Само |
| Г) 864 г. | 4) Узнікненне Вялікамараўскай дзяржавы |

**А2 Б3 В4 Г1**

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Сярэдніх вякоў : вучэб. дапаможнік для 6-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання і выхавання / А. А. Прохараў [і інш.] ; пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Народная асвета, 2023. – § 16, с. 102–103.

**24. Суаднясіце карціны з імёнамі мастакоў і іх назвамі:**

| | |
|---|---|
| А)  | 1) Дэкрэт аб міры.<br>У. Сяроў |
| Б)  | 2) Раніца ў кастрычніку.<br>Мінск. 1917 г.<br>Н. Воранаў |
| В)  | 3) Рэвалюцыя.<br>М. Шагал |

| | |
|---|---|
| Г)  | 4) Дэкрэт аб зямлі.<br>У. Сяроў |

**<u>А2 Б1 В4 Г3</u>**

На аснове матэрыялаў: Паноў, С. В. Гісторыя Беларусі, 1917 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. В. Паноў, У. Н. Сідарцоў, В. М. Фамін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. – § 1, с. 7–12.

**25. Суаднясіце партрэты з імёнамі военачальнікаў Вялікай Айчыннай вайны:**

| | |
|---|---|
| А)  | 1) Г. Ф. Захараў |
| Б)  | 2) І. Д. Чарняхоўскі |
| В)  | 3) К. К. Ракасоўскі |

| | |
|---|---|
| Г)  | 4) І. Х. Баграмян |

**<u>А4 Б3 В2 Г1</u>**

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – § 13, с. 161–163.

Паважаныя члены журы!
У заданнях 26–30 трэба было вызначыць
і запісаць правільную паслядоўнасць падзей.
**За кожнае поўнае правільнае суаднясенне – 4 балы.**

**26. Расстаўце ў храналагічным парадку падзеі з гісторыі Старажытнага свету:**

А) Перамога над грэкамі ў бітве пры Херанеі
Б) Бітва пры Фермапілах
В) Пелапанэская вайна ў Грэцыі
Г) Бітва пры Марафоне

**<u>ГБВА</u>**

На аснове матэрыялаў: Гісторыя Старажытнага свету (у 2 частках, частка 2): вучэб. дапаможнік для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. С. Кошалеў, А. А. Прохараў, В. У. Перзашкевіч, В. Г. Жураўлевіч ; пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Народная асвета, 2019. – § 8, с. 31–32, § 9, с. 35–39, § 10, с. 40–41.

**27. Расстаўце ў храналагічным парадку падзеі гісторыі Вялікага Княства Літоўскага:**

А) Выданне Судзебніка Казіміра
Б) Сумеснае праўленне Альгерда і Кейстута
В) Бітва пад Вількамірам
Г) Праўленне Войшалка

**<u>ГБВА</u>**

На аснове матэрыялаў: Цемушаў, С. М. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання і выхавання / С. М. Цемушаў,

Ю. М. Бохан ; пад рэд. І. А. Марзалюка. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2023. – § 17, с. 124–125, § 18, с. 129–130, § 25, с. 176–178.

**28. Расстаўце падзеі Другой сусветнай вайны ў храналагічным парадку:**

А) Капітуляцыя Нідэрландаў

Б) Акружэнне і знішчэнне нямецкіх войск у бабруйскім «катле»

В) Смаленская бітва

Г) Стварэнне Беларускага штаба партызанскага руху

**АВГБ**

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – с. 239–241.

**29. Расстаўце ў храналагічным парадку падзеі Навейшага часу:**

А) Заснаванне Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы

Б) Рэспубліка Беларусь стала паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва

В) Стварэнне Еўразійскага эканамічнага саюза

Г) Заснаванне Садружнасці Незалежных Дзяржаў

**ГАВБ**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025. – § 48, с. 268–277.

**30. Расстаўце ў храналагічным парадку падзеі гісторыі Беларусі:**

А) Выпуск першых колавых трактароў «Беларусь»

Б) Першае ў СССР выпрабаванне атамнай бомбы

В) Здымкі кінастужкі «Я родам з дзяцінства»

Г) Аварыя на Чарнобыльскай АЭС

**БАВГ**

На аснове матэрыялаў: Паноў, С. В. Гісторыя Беларусі, 1917 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. В. Паноў, У. Н. Сідарцоў, В. М. Фамін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. – § 20, с. 103, § 22–23, с. 117, § 24–25, с. 124–130.

Паважаныя члены журы!
У заданнях 31–35 патрабавалася вызначыць правільныя сцверджанні.
Для адказу трэба было выбраць адпаведную літару.
Правільны адказ выдзелены тлустым шрыфтам.
**За правільны адказ – 2 балы.**

**31.**
1) У 1918 г. у Германіі ў пячоры Ле-Мусцье былі знойдзены рэшткі старажытнага чалавека.
2) Першыя металічныя вырабы з’явіліся ў канцы 7–6-га тыс. да н. э.

А) Правільнае толькі 1
Б) Правільнае толькі 2
В) Абодва суджэнні правільныя
**Г) Абодва суджэнні няправільныя**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – § 1, с. 25, § 2–3, с. 33.

**32.**
1) Бітва на Нямізе адбылася 3 сакавіка 1067 г.
2) Незалежнасць Тураўскае княства набыло ў 1157 г.

А) Правільнае толькі 1
Б) Правільнае толькі 2
**В) Абодва суджэнні правільныя**
Г) Абодва суджэнні няправільныя

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – §14–15, с. 157–159.

**33.**
1) З 1766 г. у Рэчы Паспалітай былі ўведзены адзіныя меры вагі, аб’ёму, даўжыні.
2) У 1532 г. у Нясвіжы Сымон Будны выдаў «Катэхізіс» на старабеларускай мове.

**А) Правільнае толькі 1**

Б) Правільнае толькі 2

В) Абодва суджэнні правільныя

Г) Абодва суджэнні няправільныя

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – § 43–44, с. 229, § 45, с. 236.

**34.**

1) Вёска Хатынь была спалена 23 сакавіка 1942 г.
2) Рэжысёр фільма «Апакаліпсіс сёння» пра в'етнамскую вайну – Ф. Ф. Копала.

А) Правільнае толькі 1

**Б) Правільнае толькі 2**

В) Абодва суджэнні правільныя

Г) Абодва суджэнні няправільныя

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – § 8, с. 102.

На аснове матэрыялаў: Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. С. Кошалеў, М. А. Краснова, пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. – § 32, с. 168.

**35**.

1) У 1990 г. Чэхаславакія была перайменавана ў Чэшскую і Славацкую Федэратыўную Рэспубліку.

2) У 1970-я гг. у Італіі найбуйнейшай экстрэмісцкай арганізацыяй былі «Чырвоныя брыгады», якія аб'ядноўвалі беспрацоўную моладзь.

А) Правільнае толькі 1

Б) Правільнае толькі 2

**В) Абодва суджэнні правільныя**

Г) Абодва суджэнні няправільныя

На аснове матэрыялаў: Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. С. Кошалеў, М. А. Краснова, пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. – § 30, с. 157, § 31, с. 163.

Паважаныя члены журы!
У заданнях 36–40 патрабавалася вызначыць
па апісанні жыцця і дзейнасці гістарычную асобу.
Дзе магчыма, неабходна было ўпісаць прозвішча і імя.
Правільны адказ выдзелены тлустым шрыфтам.
**За правільны адказ – да 2 балаў.**

**36.** Гэты князь правіў у Кукенойсе ў пачатку XIII ст. У яго скläліся вельмі дрэнныя адносіны з літоўцамі. У барацьбе з імі князь быў гатовы нават карыстацца дапамогай крыжакоў. Рыжскаму епіскапу ён аддаў палову сваіх зямель, але хутка зразумеў, што крыжакі – ненадзейныя саюзнікі. У 1208 г. ён знішчыў рыцараў, якія знаходзіліся ў яго горадзе. Князь разлічваў на дапамогу полацкага князя Уладзіміра. Не дачакаўшыся яе, ён спаліў свой горад і адышоў у Ноўгарад.

**Вячка (Вячаслаў).**

На аснове матэрыялаў: Цемушаў, С. М. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання і выхавання / С. М. Цемушаў, Ю. М. Бохан ; пад рэд. І. А. Марзалюка. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2023. – § 12, с. 86.

**37.** Канадскі вучоны, аўтар сучаснага бестсэлера «Найлепшае ў нас. Чаму гвалту ў свеце паменшала». Аўтар спецыялізуецца на эвалюцыйнай псіхалогіі, якая вывучае спецыфічныя псіхалагічныя асаблівасці чалавека як прадстаўніка віду Homo sapiens. У сваёй кнізе вучоны прапануе гіпотэзу, што самым крывавым стагоддзем у гісторыі чалавецтва было не XX ст., як можа падацца на першы погляд сучаснаму чалавеку, а ўсё ж стагоддзе XVII.

**Стывен Пінкер.**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – § 32–33, с. 128.

**38.** Італьянскі філосаф і паэт. Стварыў вучэнне аб бязмернасці, бясконцасці і вечнасці Сусвету. Пераследаваўся царкоўнікамі за крытыку догматаў царквы, пакінуў Італію і жыў у Францыі, Англіі, Германіі. Пасля вяртання ў Італію быў абвінавачаны ў ерасі і вальнадумстве і пасля васьмігадовага заключэння ў турме спалены на кастры. Усе яго творы былі занесены каталіцкай царквой у «Індэкс забароненых кніг».

**Джардана Бруна.**

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024. – § 35, с. 158.

**39.** Удзельнік Першай сусветнай вайны. Падчас Грамадзянскай вайны змагаўся з войскамі А. І. Дзянікіна і П. М. Урангеля. Падчас вялікага тэрору 1936–1938 гг. цудам пазбегнуў арышту. Палкаводчы талент яскрава раскрыўся ў Вялікую Айчынную вайну. Аб яго працаздольнасці хадзілі легенды. Калі фашысты рваліся да Масквы, ён не спаў 11 сутак. Валодаў здольнасцю правільна ацаніць складаныя стратэгічныя абставіны, спрагназаваць магчымы ход ваенных дзеянняў. Аўтар кнігі «Успаміны і разважанні».

**Георгій Жукаў.**

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – § 5–6, с. 70.

**40.** Савецкі інжынер-канструктар, стваральнік танка Т-34, Герой Сацыялістычнай Працы. Удзельнічаў у Першай сусветнай і Грамадзянскай войнах. З 1937 г. галоўны канструктар танкавага канструктарскага бюро на Харкаўскім паравозабудаўнічым заводзе імя Камінтэрна.

**Міхаіл Кошкін.**

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапам. для 9 (11) кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2022. – § 14, с. 175.

Паважаныя члены журы!

У заданнях 41–50 неабходна было вызначыць прыведзеныя ніжэй паняцці. Правільны адказ выдзелены тлустым шрыфтам.

**За кожны адказ – да 2 балаў.**

| | |
|---|---|
| **41. Цэнтралізаваная дзяржава**<br>С. 10 | дзяржава, у якой тэрыторыя краіны падпарадкоўваецца аднаму цэнтру, дзейнічае адзіная сістэма кіравання і заканадаўства |
| **42. Мануфактура**<br>С. 21 | прадпрыемства, заснаванае на падзеле працы і выкарыстанні ручной працы наёмных рабочых |
| **43. Саслоўна-прадстаўнічая** | форма праўлення, пры якой у кіраванні дзяржавай удзельнічаюць органы саслоўнага прадстаўніцтва |

| | |
|---|---|
| **манархія** С. 11 | |
| **44. Сойм**<br>С. 39 | дарадчы, а з XVI ст. галоўны заканадаўчы орган ВКЛ, які складаўся з найвышэйшых чыноўнікаў, духавенства і прадстаўнікоў шляхты |
| **45. Народнасць**<br>С. 92 | устойлівая супольнасць людзей, якая характарызуецца адзінствам паходжання, адзінай мовай, тэрыторыяй, эканамічным жыццём і культурай, псіхічным складам (характарам), этнічнай самасвядомасцю |
| **46. Капіталізм**<br>С. 141 | грамадскі лад, заснаваны на прыватнай уласнасці, наёмнай працы і рыначнай эканоміцы |
| **47. Рэфармацыя**<br>С. 162 | масавы рэлігійны, сацыяльна-палітычны рух XVI ст., накіраваны на пераўтварэнне рымска-каталіцкай царквы, які прывёў да ўзнікнення пратэстантызму |
| **48. Абсалютызм**<br>С. 125 | форма праўлення, пры якой манарху належыць неабмежаваная ўлада |
| **49. Каланіялізм**<br>С. 114 | сістэма панавання групы развітых дзяржаў Заходняй Еўропы над астатнім светам, пачынаючы з XVI ст. |
| **50. Этнічная самасвядомасць**<br>С. 94 | разуменне сваёй прыналежнасці да таго ці іншага этнасу |

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024.

Паважаныя члены журы!

У заданнях 51–55 неабходна было вызначыць сучасныя назвы, на тэрыторыі якіх размяшчаліся пазначаныя краіны, рэгіёны і калоніі. Правільныя адказы выдзелены тлустым шрыфтам.

**За кожны правільны адказ - 2 балы.**

| | |
|---|---|
| 51. Сіям | **Тайланд** |
| 52. Бечуанленд | **Бацвана** |
| 53. Паўднёва-Заходняя Афрыка | **Намібія** |
| 54. Новая Іспанія | **Мексіка** |
| 55. Паўночная Радэзія | **Замбія** |

На аснове матэрыялаў: Кошалеў, В. С. Сусветная гісторыя : вучэб. дапаможнік для 7-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання і выхавання / В. С. Кошалеў [і інш] ; пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024.

Кошалеў В. С. Сусветная гісторыя Новага часу, XIX – пачатак XX ст. : вучэб. дапаможнік для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. С. Кошалеў, Н. В. Кошалева, Н. В. Байдакова ; пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2018.

На аснове матэрыялаў: Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 1 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2025.

Паважаныя члены журы!
У заданнях 56–70 неабходна было разгадаць крыжаванку.
**За кожнае правільна адзначанае слова – 1 бал.**

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | [9]б | е | л | н | а | ц | [2]к | а | м | | | | | | | |
| | | | | [7]а | | | | | | | | | | е | | | | | [11]з | | | | |
| | | | | ў | | | | | | | | | | [8]м | і | л | і | т | а | р | ы | з | м |
| | | [6]п | | т | | | | | | [1]з | | | | а | | | | | х | | | | |
| | [5]н | а | р | а | ч | а | н | с | к | а | я | | | л | | | | | о | | | [14]х | |
| | | ц | | н | | | | | | х | | | | і | | | | | д | | | а | |
| | | ы | | о | | | | | | а | | [15]с | | з | | | | | н | | | р | |
| | | ф | | м | | | [3]г | [4]а | н | д | з | і | з | м | | | | | е | | | ч | |
| | | і | | і | | | | м | | н | | н | | | | | | | р | | | п | |
| | | к | | я | | | | е | | і | | д | | | [13]р | э | [12]к | р | у | ц | к | а | я |
| | | а | | | | | | р | | ц | | ы | | | | | а | | с | | | д | |
| | | ц | | | | | | ы | | т | | к | | | | | р | | і | | | а | |
| | | ы | | | | | | к | | в | | а | | | | | а | | з | | | т | |
| | | я | | | | | | а | | а | | т | | | | | н | | м | | | а | |
| | | | | | | | | н | | | | ы | | | | | і | | | | | к | |
| | | | | | | | | с | | | | | | | | | з | | | | | | |
| | | | | | | | | к | | | | | | | | | а | | | | | | |
| | | | | | | | | [10]і | н | в | е | н | т | а | р | | ц | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | | | ы | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | | | я | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |

**Па гарызанталі:**

**3.** Сацыяльна-палітычнае і рэлігійна-філасофскае вучэнне, якое ўзнікла ў перыяд барацьбы Індыі за незалежнасць і атрымала назву па імені яго заснавальніка.

**5.** Наступальная аперацыя рускай арміі ў сакавіку 1916 г.

**8.** Ідэалогія і палітыка актыўнага нарошчвання і выкарыстання ваеннай моцы дзяржавы; дамінаванне ваенных у дзяржаўным і грамадскім жыцці.
**9.** Аддзел Наркамата па справах нацыянальнасцей РСФСР, створаны ў 1918 г. на чале з А. Чарвяковым.
**10.** Вопіс прыватных уладанняў у ВКЛ і Расійскай імперыі.
**13.** Павіннасць, заснаваная на сістэме камплектавання рэгулярнай арміі ў Расійскай імперыі ў XVIII–XIX стст., якая прадугледжвала прызыў пэўнай часткі асоб мужчынскага полу (рэкрутаў) на ваенную службу.

**Па вертыкалі**:
**1.** Кірунак рускай грамадскай думкі 1840-х–1850-х гадоў, які выступаў за адмену прыгоннага права і прызнанне неабходнасці развіцця Расіі па заходнееўрапейскім шляху.
**2.** Ідэалогія турэцкага нацыяналізму, прапанаваная Атацюркам, у аснове якой ляжаць 6 асноўных прынцыпаў.
**4.** Шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, для якога характэрна стварэнне хутарскіх гаспадарак, замацаванне зямлі за непасрэдным вытворцам-фермерам, свабодны продаж і купля зямлі, распаўсюджанне арэнды, выкарыстанне наёмнай працы.
**6.** Назва карных аперацый у Польшчы ў міжваенны перыяд у межах палітыкі Ю. Пілсудскага.
**7.** Права ўнутранага самакіравання, якое прадастаўляецца асобнай тэрыторыі ці народу, які кампактна пражывае ў межах дзяржавы.
**11.** Сістэма поглядаў, прыхільнікі якой разглядалі беларусаў як частку трыадзінага тытульнага народа Расійскай імперыі.
**12.** Элемент палітыкі беларусізацыі, накіраваны на развіццё мовы і культуры ўсіх нацыянальнасцей, якія пражывалі ў Савецкай Беларусі, а таксама прыцягненне ў органы кіравання жыхароў-ураджэнцаў Беларусі.
**14.** Фіксаваны харчовы натуральны падатак, які спаганяўся з сялянскіх гаспадарак, уведзены замест харчразвёрсткі.
**15.** Аб’яднанні прадпрыемстваў з мэтай знішчэння канкурэнцыі і паляпшэння ўмоў дзейнасці ў вобласці вызначэння цэн, закупкі сыравіны, збыту прадукцыі; пры гэтым за членамі аб’яднанняў захоўваецца вытворчая і юрыдычная самастойнасць.

Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя прагр. агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) : у 2 ч. Ч. 2 / А. Г. Каханоўскі [і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага ; пер. на беларус. мову В. М. Іваноў. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2024.

На аснове матэрыялаў: Паноў, С. В. Гісторыя Беларусі, 1917 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. В. Паноў, У. Н. Сідарцоў, В. М. Фамін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019.

На аснове матэрыялаў: Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1918 г. – пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. С. Кошалеў, М. А. Краснова, пад рэд. В. С. Кошалева. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019.